# Журналістыка

*МАХАМЕД САЛЕМ ульд МАХАМЕД ЕДЫХ*, (МАЎРЫТАНІЯ)

## АРАБСАТ У СІСТЭМЕ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ АРАБСКІХ КРАІН

Ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека падкрэсліваецца: "Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на свабоднае выказванне іх". Гэта права ўключае свабоду беспераШкодна прытрымлівацца сваіх перакананняў і свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі і незалежна ад дзяржаўных межаў. Увесь новы і навейшы перыяды гісторыі характарызаваліся жорсткай барацьбой за здзяйсненне гэтага права. Дыяпазон перашкод на шляху свабоднага распаўсюджвання інфармацыі амаль неабмежаваны: іх характар і сур'ёзнасць, колькасць і частата ў розных краінах адрозніваюцца, але характэрна, што яны маюцца ва ўсіх грамадствах. Але самай істотнай перашкодай у гэтых адносінах з'яўляецца нераўнапраўны абмен навінамі і ідэямі паміж індустрыяльна развітымі краінамі багатай Поўначы і развіваючыміся рэгіёнамі беднага Поўдня. Толькі, напрыклад, тры інфармацыйныя агенцтвы ЗША – ЮСІА, АП і ЮПІ – распаўсюджваюць сёння каля 50 мільёнаў слоў у суткі, гэта значыць прыкладна столькі, колькі інфармацыйныя агенцтвы астатніх краін разам узятыя! Нераўнапраўны абмен навінамі і ідэямі аказвае непажаданы ўплыў практычна на ўсе базісныя і надбудовачныя інстытуты краін у стане развіцця, асабліва на іх геапалітыку, эканоміку, культуру, духоўнасць.

Многія краіны, а то і цэлыя рэгіёны беднага Поўдня імкнуцца вызваліцца ад кайданаў "інфармацыйнай агрэсіі" індустрыяльна развітых дзяржаў. Паказальны ў гэтых адносінах прыклад Арабскага Усходу.

У 1976 г. Ліга арабскіх краін заснавала на кааператыўных пачатках арганізацыю спадарожнікавай камунікацыі АРАБСАТ, якая ахапіла 21 дзяржаву Арабскага Усходу, у тым ліку Саудаўскую Аравію, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Алжыр, Маўрытанію, Марока, Егіпет. У 1984 г. гэтай арганізацыяй быў здейснены запуск першага арабскага спадарожніка сувязі, які паклаў пачатак развіццю агульнанацыянальнай арабскай сеткі радыёвяшчання, тэлебачання, інфармацыйных агенцтваў, а таксама іншых сродкаў масавай інфармацыі.

9 чэрвеня і 13 лістапада 1996 г. былі запушчаны ў космас два новыя спадарожнікі сувязі. Трэцяе пакаленне спадарожнікаў АРАБСАТА пачало свой адлік з першага квартала 1999 г., калі быў запушчаны чарговы спадарожнік, абсталяваны унікальнай сучаснай тэхнікай для тэлерадыёвяшчання. У выніку апошнім часам значна паменшыўся "інфармацыйны націск" краін багатай Поўначы на арабскія рэгіёны, скарацілася распаўсюджванне несумленнай, падтасаванай, а часам і хлуслівай прапаганды з боку такіх інфармацыйных агенцтв, як ЮСІА, АП, ЮПІ, Франс-прэс і Рэйтэр. Гэтаму садзейнічала таксама купля саудаўскім мільянерам Валідам тэлекампаніі ЭМ-БІ-СІ.

Спецыялісты ў галіне сродкаў масавай інфармацыі сцвярджаюць, што з запускам арабскіх спадарожнікаў колькасць тэлерадыёстанцый, а таксама газет, часопісаў у рэгіёне павінна павялічыцца на адну трэць. У 1985 г. тут дзейнічала 550 тэлестанцый, 500 радыёстанцый, 43 млн радыёпрыёмнікаў (229 на 1000 чалавек) і прыходзілася толькі 1,1 кг друкарскай паперы на аднаго чалавека[1]. Гэтыя паказчыкі павінны павялічыцца ў тры разы, што карэнным чынам змяніць сітуацыю супрацьстаяння культурнаму, геапалітычнаму і эканамічнаму "інфармацыйнаму націску" ЗША і краін Захаду на Бліжні Усход і будзе садзейнічаць справядліваму, раўнапраўнаму, інфармацыйнаму абмену. Мэтанакіраваны, палітычна падтасаваны інфармацыйны паток тэлерадыёпраграм Захаду арыентаваны на арабскі рэгіён у мэтах разбурэння нацыянальнай культуры і "прамывання мазгоў". Гэта пацвярджае вялікая колькасць спадарожнікаў, а таксама радыётэлестанцый індустрыяльна развітых краін, накіраваных выключна толькі на арабскі свет, якія вяшчаюць па 7 гадзін у дзень. А працягласць перадач станцый БІ-БІ-СІ і "Голасу Амерыкі" на арабскі рэгіён павялічылася з 7 гадзін вяшчання да 9 і склала гіганцкую лічбу: 3285 гадзін у суткі[2]!

У сувязі з такім становішчам Ліга арабскіх краін і Арабскай арганізацыі па навуцы і культуры паставілі перад сабой задачу распрацаваць комплекс мер, якія маглі б стаць "крэпасцю" перад новым націскам інфармацыйнай і культурнай экспансіі ЗША і Захаду на Бліжні Усход. У гэты комплекс мер уключалася перш за ўсё стварэнне магутнай інфармацыйнай інфраструктуры на базе апошніх дасягненняў навукі і тэхнікі, узмацненне яе прафесійнымі кадрамі, насычэнне высокаякаснымі праграмамі па праблемах культуры, нацыянальнай эканомікі, сацыяльнай сферы, а таксама выпуск такой газетна-часопіснай прадукцыі, якая свабодна канкурыравала бы з выданнямі ЗША і Захаду і паступова "выштурхоўвала" іх з рынку як шкодныя для арабскага чытача.

Але на гэтым шляху сустрэліся шматлікія цяжкасці. Будаўніцтва такой "крэпасці" патрабуе часу, вялікіх сродкаў, самай навейшай тэхналогіі, якую ЗША і Захад не спяшаюцца прадаваць нават па завышанай цане. У выніку АРАБСАТ як важная інфармацыйная інфраструктура арабскіх краін штодзённа сутыкаецца са шматлікімі цяжкімі праблемамі. Адна з іх – вельмі нізкі ўзровень пісьменнасці насельніцтва арабскага рэгіёна, асабліва гэта акалічнасць тычыцца сельскіх жыхароў, колькасць якіх складае 98 884 000 (даныя 1985 г.) ці 52 % агульнай колькасці насельніцтва Арабскага Усходу. Па прагнозах спецыялістаў, у 2025 г. колькасць сельскіх жыхароў складзе 132 246 000, што яшчэ больш драматызуе праблему.

Непісьменнасць, якая стала асабліва шкодным фактарам для функцыянавання сродкаў масавай інфармацыі ў грамадстве, дае магчымасць ЗША і Захаду канцэнтраваць сваю ўвагу на электронных СМІ, распаўсюджванні сексуальных, прыгодніцкіх і авантурных праграм, якімі захапляецца менавіта арабскае непісьменнае насельніцтва сельскай мясцовасці. АРАБСАТУ цяжка супрацьстаяць такім праграмам таму, што нацыянальныя выпускі ўступаюць па сваёй прафесійнай якасці і паэтаму неканкурэнтназдольныя.

Непісьменнасць таксама балюча сказваецца на распаўсюджанасці газетна-часопіснай перыёдыцы. Так, сёння ў арабскіх краінах на 1000 чалавек прыпадае толькі 60 адзінак газет ці часопісаў, у той час як у Еўропе на 1000 чалавек – 264. У арабскім свеце штодзённая прэса распаўсюджваецца ў колькасці 6 млн экземпляраў, а ў Еўропе – 127[3].

У той жа час тэлевізійны эфір ахоплівае амаль усе рэгіёны Арабскага Усходу і трансліруе адносна вялікую колькасць гадзін – 30 000. Першае месца належыць егіпецкаму тэлебачанню – 6648 гадзін, ці больш 18 гадзін кожны дзень, другое – Аб'яднаным Арабскім Эміратам – 4588 гадзін ці 12 гадзін штодзённа, трэцяе – Хашыміцкаму Каралеўству Іарданія, чацвёртае – Алжыру.

Адна са складаных праблем актыўнага супрацьстаяння "інфармацыйнаму націску" індустрыяльна развітых краін на арабскія рэгіёны – дзейнасць шматлікіх так званых незалежных радыётэлекамунікацыйных арганізацый, друкарняў, газет і часопісаў. Характэрна, што амаль усе яны фінансуюцца і ідэйна накіроўваюцца інфармацыйнымі і дзяржаўнымі службамі ЗША і Захаду. Гэтыя арганізацыі ў канкурэнтнай барацьбе літаральна "з'ядаюць" многія нацыянальныя карпарацыі ці падпарадкоўваюць іх свайму ўплыву. Дзяржаўная вертыкаль не можа ўсур'ёз весці барацьбу з такімі арганізацыямі. Тут жа чуецца строгі вокліч з-за акіяна, пагрозы аб санкцыях за парушэнне правоў чалавека на атрыманне інфармацыі, пакушэнне на міжнародную лібералізацыю сродкаў масавай інфармацыі і абвастрэнне міжнародных адносін. Таму, можна сказаць, такія празаходнія, праамерыканскія арганізацыі і іх выданні дзейнічаюць пад лозунгамі "свабоднага патоку інфармацыі", "свабоднага доступу да інфармацыі", "свабоднага статусу дзейнасці журналіста ў грамадстве" і іншых, чаго на самой справе нідзе не існуе ў ідэальным выглядзе.

У такіх складаных умовах АРАБСАТ усё ж працягвае барацьбу супраць нераўнапраўнага, аднабаковага распаўсюджвання інфармацыі з Поўначы на Поўдзень: 99 % інфармацыі ідзе з багатай Поўначы на бедны Поўдзень і толькі 1 % – у адваротным напрамку. Краіны АРАБСАТА лічаць, што новы міжнародны інфармацыйны і камунікацыйны парадак павінен стаць адным з асноўных рычагоў стварэння новага эканамічнага парадку і што новы арабскі спадарожнік павінен сур'ёзна паўплываць на развіццё не толькі нацыянальнай культуры, але і стварыць новы дынамізм у міжнародных адносінах, у сферы справядлівага, збалансаванага на роўнасці і ўзаемнай павазе інфармацыйнага і камунікацыйнага сусветнага пейзажу.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і перашкоды, АРАБСАТ стаў важным каналам міжарабскага інфармацыйна-культурнага абмену. Праз яго ідзе ў сучасны перыяд 60 % усёй неабходнай палітычнай, эканамічнай, лінгвістычнай і іншай аператыўнай інфармацыі, што з'яўляецца важным стымулам каардынацыі дзеянняў для сумесных вырашэнняў сацыяльна-эканамічных, палітычных і іншых праблем. АРАБСАТ неабходна і надалей выкарыстоўваць на карысць і дабрабыт арабскай нацыі, яе ўмацаванне і яднанне перш за ўсё супраць камунікацыйна-інфармацыйнага выкліку ЗША і Захаду.

У той жа час яднанне краін АРАБСАТА і запуск імі сучасных спадарожнікаў сувязі – сведчанне таго, што Арабскі Усход увайшоў, нягледзячы на агульную адсталасць, у прастору касмічнага тэлебачання, дзе прамыя трансляцыі праграм ахопліваюць практычна ўвесь свет. На практыцы гэта значыць, што навейшы спадарожнік 3[а] не толькі супрацьстаіць інфармацыйнаму націску ЗША і Захаду, але і інтэнсіўна, праўдзіва распаўсюджвае аператыўную інфармацыю з Бліжняга Усходу на ўсе кантыненты і рэгіёны, што зближае арабаў з іншымі народамі, садзейнічае эфектыўнаму ўплыву арабскай культуры на сусветную цывілізацыю. У гэтых адносінах вялікая роля належыць вытворчасці сумесных праграм АРАБСАТУ з тэлерадыёкампаніямі іншых краін. Гэта перш за ўсё мастацка-культурныя праграмы, якія даюць арабскаму гледачу магчымасць засвойваць здабыткі сусветнай цывілізацыі, заставацца пры гэтым у сваім культурным асяроддзі, зберагаючы свае духоўныя каштоўнасці.

Трэба асабліва адзначыць і той факт, што краіны АРАБСАТА, імкнучыся абмежаваць "інфармацыйны націск" ЗША і Захаду і зберагаючы тым самым сваё пачэснае месца ў міжнароднай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы, робяць і другія важныя крокі, каб узмацніць свае нацыянальныя СМІ. Так, напрыклад, Саудаўская Аравія, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Алжыр і Маўрытанія актывізавалі свае намаганні па стварэнні незалежнай ад індустрыяльна развітых рэгіёнаў усеарабскай сістэмы касмічнай сувязі. На думку стваральнікаў, такая сістэма павінна ахапіць увесь Арабскі Усход, абслугоўвацца толькі нацыянальнымі прафесійнымі кадрамі, распрацоўваць пра-

екты, праграмы развіцця арабскіх краін з улікам мясцовага значэння. Вырашэнне праграмы ўмацуе незалежнасць Бліжняга Усходу ад ЗША і Захаду ў многіх стратэгічных адносінах, у тым ліку і інфармацыйным.

Гэта сістэма сувязі ахопіць рэгіён па акваторыі Міжземнага мора ад Касабланкі да Аль-Арыша, а пасля і распаўсюдзіцца на ўсе ісламскія краіны. Сістэма павінна значна спрасціць дзейнасць АРАБСАТА, узмацніць эфектыўнасць яго работы і паскорыць дасягненне мэты. Трэба мець таксама на ўвазе і тое, што працэс развіцця касмічнага тэлебачання і радыёвяшчання пастаянна патрабуе мадыфікацыі існуючых аб'яднанняў, стварэння новых мабільных, фінансава забяспечаных, якія ні на крок не адставалі б ад жыцця, прагрэсіўных тэхналогій. Прычым краіны арабскага рэгіёну бачаць выхад з няроўнапраўнага "статус-кво" у сучаснай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы не толькі ў запуску нацыянальных спадарожнікаў сувязі, але і ва ўтварэнні сістэм касмічнай сувязі на парытэтных пачатках, на справядлівым падыходзе да раўнапраўнага ўдзелу кожнай маленькай і вялікай нацыі ў СМІ. Вырашэнне праблемы павінна засяроджвацца на тым, каб тэлевізійныя перадачы праз спадарожнікі сувязі служылі выключна інтарэсам міра і ўзаемапаразумення народаў, распаўсюджвалі толькі праўдзівую інфармацыю, выключылі з тэлерадыёпраграм хлусню, падбухторванне да нацыянальных канфліктаў, прапаганду мілітарызму, расізму, распальванне канфесіянальных і абшчынных сутычак, умацоўвалі спрыяльныя міжнародныя адносіны, забяспечвалі развіццё нацыянальнай адукацыі і культуры. Тэлерадыёперадачы, якія ахопліваюць тэрыторыю іншых дзяржаў, павінны трансліравацца толькі з афіцыйнага дазволу прымаючымі гэтыя праграмы краінамі.

Такім чынам, АРАБСАТ адыгрывае выключна важную ролю ў барацьбе супраць "інфармацыйнага націску" індустрыяльна развітых краін на Бліжні Усход, садзейнічае будаўніцтву новай міжнароднай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы. Нягледзячы на цяжкасці і складанасці, гэта барацьба ўжо прынесла арабскаму народу вялікую карысць, пераканала, што АРАБСАТУ пад сілу вырашаць самыя складаныя праблемы. Але яны могуць быць рэалізаваны толькі ў тым выпадку, калі ўрадам арабскіх краін удасца выстаяць перад спакусай паставіць сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі на службу вузкім інтарэсам, ператварыўшы іх у сродак палітычнага націску, апраўдання замаху на чалавечы гонар і распаленне ідэй няроўнасці паміж арабамі. Пажадана таксама, каб АРАБСАТ садзейнічаў пазбаўленню ад палітычнага эгаізму некаторых кіраўнікоў арабскіх дзяржаў, устанаўленню пастаяннага дыялогу паміж імі на узаемавыгаднай аснове для таго, каб зберагчы сваю культуру, нацыянальную незалежнасць і суверэнітэт.

[1] PARK. Media 1997. Saudi Aravia.
[2] СМІ і палітычны ўплыў на арабскае грамадства. Туніс, 1992 (на арабскай мове).
[3] Arab Information. Tunis. № 7–8.